**Адынец Антон**



Антон (Антоні) Эдвард Адынец (25 студзеня 1804, Гейстуны Ашмянскага павета Віленскай губерні (цяпер Ашмянскі раён Гродзенскай вобласці) — 15 студзеня 1885, Варшава; Псеўданім: Інацэнты Старушкевіч), беларускі паэт, перакладчык, мемуарыст, выдавец. Пісаў на польскай мове.

Скончыў Барунскую базыльянскую школу ў 1820 і Віленскі універсітэт у 1823 (магістр права). Ва універсітэце стаў сябрам таварыства філарэтаў, якому прысвяціў "Песню філарэтаў" (пазней Ф. Багушэвіч зрабіў пераробку гэтага твора пад назваю "Песня"). Сябраваў з А. Міцкевічам, Я. Чачотам, Т. Занам, І. Дамейкам, І. Ходзькам, І. Лялевелем. Пабачыўшы паэтычныя здольнасці Адынца, Чачот узяў яго пад сваю апеку, за гэта сябры празвалі Чачота Ментарам, а Адынца — Тэлемакам (паводле грэчаскай міфалогіі, Ментар быў выхавальнікам Тэлемака). Па справе таварыства быў зняволены ў лістападзе 1823 — лютым 1824. У 1829-1837 вандраваў па Заходняй Еўропе, часам спадарожнічаў А. Міцкевічу, жыў у Дрэздэне. У 1837 вярнуўся ў Гейстуны, а з 1838 жыў у Вільні. Быў рэдактарам альманаха "Melitele" (1829) і газеты на рускай і польскай мовах "Виленский вестник" (1841-1859). Паступова погляды Адынца сталі больш кансерватыўнымі. У прыватнасці, у 1858 ён удзельнічаў у выданні "Віленскага альбома" у гонар Аляксандра II. З 1866 жыў у Варшаве, супрацоўнічаў у розных газетах і часопісах. Ёсць звесткі, што ў 1884, калі разам з Дамейкам Адынец наведваў Беларусь, сустракаўся ў Крошыне з П. Багрымам. У сваёй творчасці часта выкарыстоўваў сюжэты з гісторыі Беларусі, перакладаў сусветную класіку.

Аўтар мемуарных “Лістоў з падарожжа” (1875 — 78), “Успамінаў з мінулага” (1884),вершаваных драм “Феліцыта, або Карфагенскія мучанікі” (1849), “Барбара Радзівілянка” (1860). Перакладаў на польскую мову творы Дж.Г. Байрана, А. Пушкіна, Ф. Шылера і інш.

Літаратура:

1. Цвірка К. Тэлемак з-пад Ашмянаў: Жыццё і творчасць А.Э. Адынца // Роднае слова. 1994, №3.
2. Маракоў Л.У. Рэпрэсаваныя літаратары, навукоўцы, работнікі асветы, грамадскія і культурныя дзеячы Беларусі, 1794-1991. Энц. даведнік. У 10 т. Т.1. —Мн:, 2003.
3. Пяткевіч А. М. Людзі культуры з Гродзеншчыны: Даведнік. Гродна: ГрДУ, 2000. С. – 10.
4. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 Т. Т.1. – Мн. 1993. – с. – 63.

**Астрамовіч Аляксандар**



Аляксандар Астрамовіч (псеўданім Андрэй Зязюля) (7 снежня 1878, вёска Навасады (цяпер Ашмянскі раён) — 17 студзеня 1921) — беларускі каталіцкі святар, паэт. Нарадзіўся ў сялянскай сям'і Сцяпана і Ганны Астрамовічаў.

Вучыўся ў Гальшанскай народнай (1888 — 90) і Ашмянскай павятовай (1890 — 92) вучэльнях. Пасля працаваў на бацькавай гаспадарцы, самастойна вывучаў французскую мову.

З 1 студзеня 1901 года да 14 верасня 1903 года служыў у 160-м пяхотным Абхазскім палку ў Гомелі і ў Барысаве. Закончыў службу ў званні малодшага афіцэра. У 1903 — 04 няўдала спрабаваў паступіць у Віленскую духоўную каталіцкую семінарыю. У 1905 выехаў у Пецярбург, зноў пачаў рыхтавацца да паступлення ў семінарыю. У 1905 — 1910 вучыўся ў каталіцкай духоўнай семінарыі ў Пецярбургу, дзе ўсвядоміўся як беларус. Там, як і іншыя будучыя беларускія адраджэнцы, быў пад духоўнай апекай прафесара Браніслава Эпімах-Шыпілы.У студзені 1906 вытрымаў іспыты на званне аптэкарскага вучня. У 1910 пасвечаны ў святары. Падчас вучобы пад уплывам земляка А. Лісоўскага далучыўся да беларускага культурніцкага і рэлігійнага руху. Арганізаваў аб’яднанне клерыкаў-беларусаў. З 1909 друкаваўся ў беларускай прэсе.

Душпастырскую дзейнасць пачаў вікарыем ракаўскага касцёла і першую сваю Імшу адправіў у вёсцы Трабы Валожынскага павета 2 лютага 1911 года. З 2 ліпеня 1912 года да лютага 1915 года служыў у парафіі Анопаль Мінскага дэканата. Пазней быў прызначаны вікарыем у Бабруйскую парафію. Са снежня 1916 года служыў вікарыем у Смілавічах Ігуменскага павета і ў суседніх касцёлах, выконваў абавязкі адміністратара гарадзішчанскага касцёла. З 9 верасня 1917 года — пробашч касцёла ў Абольцах Аршанскага дэканата. Два гады служыў ксяндзом у мястэчку Сянно Аршанскага дэканата. Там памёр 17 студзеня 1921 года, пахаваны на мясцовых каталіцкіх могілках.

Прыхільнік беларусізацыі рэлігійнага жыцця беларусаў-католікаў. Пераследаваўся касцельнымі ўладамі за прыхільнасць да роднага слова, два гады быў без парафіі. Актыўна ўдзельнічаў у грамадзкім жыцці Беларусі. Удзельнік з'езду беларускага каталіцкага духавенства ў Мінску (1917).

Друкаваў вершы з 1909 (у газетах «Наша Ніва», «Biełarus», «Krynica», «Вольная Беларусь», «Świetač», «Белорусская рада», «Беларускае жыццё»). Большасць ранніх вершаў 1909—1912 гг. паэт друкаваў у адраджэнскай «Нашай Ніве». Якраз тады Андрэй Зязюля пазнаёміўся і пасябраваў з Янкам Купалам, які вучыўся на агульнаадукацыйных курсах А. Чарняева ў Пецярбургу (1909—1913), а летнія канікулы праводзіў на сваім любімым хутары Акопы. Выдаў зборнік паэзіі «З роднага загону» (Вільня, 1913, 2-ое дапоўненае выданне 1931), паэму «Слова праўды аб мове і долі беларуса» (Прага, 1917). Выйшла ягонае вершаванае апавяданне «Аленчына вяселле» (Вільня, 1923). Збіраў народныя песні, якія разам з запісамі Антона Грыневіча склалі зборнік «Беларускія песні з нотамі» Т. 2. (Пецярбург, 1912).

Усе творы А. Астрамовіча паводле зместу і стылю — хрысціянскія і асветніцкія: гэта гутаркі добрага настаўніка з духоўнымі дзецьмі — маленькімі, маладымі і сталымі. Сутнасць яго багаслоўя і філасофіі можна вызначыць адным сказам — любоў да Бога і да ўсялякага Божага тварэння — ад чалавека да жывёлаў, птушак, рыбаў, раслінаў, кожнай былінкі і кветкі. Найперш — да Беларусі, роднага народа, беларускай мовы, культуры, народнага побыту. Афарыстычна паэтава любоў абазначана назваю зборніка вершаў — «З роднага

загону». Але тут — не хутаранская філасофія, як можа здацца нявопытнаму крытыку. Родны загон для паэта быў тою зоркаю, з вышыні якой ён хацеў абняць і пашкадаваць увесь Божы свет. Пашкадаваць — і паплакаць над ягонаю доляю. Бо, як казаў славуты хрысціянскі філосаф Мікалай Бярдзяеў: “Вся тварь стенает и взывает ко своему Творцу”.

Пасля абвяшчэння БНР па даручэнні Народнага сакратарыяту арганізоўваў рэгіянальныя Рады ў Магілёўскай губерні. За нацыянальна-рэлігійную дзейнасць пераследаваўся бальшавіцкімі ўладамі, быў арыштаваны і некалькі тыдняў сядзеў у турме Віцебскай ЧК. Апошні год свайго жыцця працаваў у мястэчку Сянно. Пахаваны на мясцовых могілках.

Успамінаючы асобу паэта, А. Станкевіч пісаў: «Характарам Астрамовіч быў шчыры, дзіўна просты, запальны і гарачы, заўсёды вясёлы, добры, услужны, горача пабожны і дзіўна патрыятычны [...]. Зязюля адчуваў Бога проста, часта аж наіўна, па-дзяціннаму, выключна сэрцам»

У прадмове да пасмяротнага выдання выбраных твораў А. Зязюлі А. Станкевіч пісаў: “Усе тыя куткі Ашмяншчыны і Валожыншчыны, як Гальшаны, Трабы, Вішнёва, Баруны, Крэва, дзе часта пабываў Зязюля, помняць яго і сяння. Нёс ён туды прамень праўды, святло беларускай народнай сведамасці як жывым словам, так і праз родную кніжку і газэту [...]. Зязюля — гэта праўдзівы ідэаліст, гэта мучанік за родную ідэю”.

Шчыра любіў Астрамовіч сваю бацькаўшчыну і гэтую любоў ён выяўляў і словам, і чынам, і прышчэпліваў яе іншым. Так аб гэтым кажа ён у вершы «Пасвята»:

Любы мне куток радзімы,
Беларусь святая:
Тут радзіліся, раслі мы,
Усё тут нас вітае.

Люба родная гаворка,
Душам нашым світа,
З ёй, ці соладка, ці горка,
Мы жывём і квіта.

Любы родныя апраткі,
Норавы і звычка,
Песні, казкі і загадкі,
Люб народ мужыцкі.

Вось гарджуся гэтым родам,
Не хачу другога,
Бо ён злучаны з народам
Краю дарагога.

Дык паслухай-жа, браточак,
Гэтакай вось рады:
Палюбі ты свой куточак,
Мову, строй, абрады.

17 студзеня 2011 года споўнілася 90 гадоў з таго часу, калі Аляксандр Астрамовіч адышоў ад нас у лепшы свет.

Літаратура:


1. Віцьбіч Ю. Бог і Бацькаўшчына: 1878—1968. У 90-я ўгодкі ад нараджэньня Андрэя Зязюлі // Божым шляхам. 1968. № 6. С. 12—15.
2. Гэрмановіч Я. Мае прыяцелі: Аляксандар Астрамовіч (Андрэй Зязюля) 26.XI.1878 — 17.I.1921 // Божым шляхам. 1965. № 2. С. 6—7.
3. Саламевіч Я. Паэт-святар Андрэй Зязюля // Беларуская мова і літаратура ў школе. 1991. № 7—8. С. 140—144.
4. Шаставец У. Крыж і церні жыцця: Андрэй Зязюля // Полымя. 1999. № 4. С. 285—296.
5. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі. У 5 т. Т. 1. Мн., 1984. С. 121.
6. http://media.catholic.by/nv/n18/art3.htm
7. Маракоў Л.У. Рэпрэсаваныя літаратары, навукоўцы, работнікі асветы, грамадскія і культурныя дзеячы Беларусі, 1794-1991. Энц. даведнік. У 10 т. Т.1. —Мн:, 2003.
8. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 Т. Т.3. – Мн. 1996. – с. – 457.

**Адважны Вінцук**



Вінцук Адважны (сапр. Германовіч Язэп Станіслававіч; 4.3.1890 — 26.12.1978; псеўданімы: Лявон Ветрагон, Хлопчык з-пад Горадні; крыптанімы: А.В., В.Адв., A.W., W.A.) — беларускі пісьменнік, каталіцкі святар усходняга абраду, паэт, публіцыст.

Нарадзіўся ў мястэчку Гальшаны Ашмянскага павета Віленскай губерні, цяпер Ашмянскі раён Гродзенскай вобласці. Паходзіў з сялянскай сям'і: бацькі — Станіслаў і Ганна (з дому Савіцкіх) Германовічы. Бацька яго памёр, калі Язэп быў яшчэ зусім маленькі. Суседзі і сваякі раілі аўдавелай маці аддаць Язэпа на навуку на шаўца, але яна не згадзілася і, нягледзячы на цяжкасці, зрабіла ўсё, каб сын вывучыўся на святара.У 1898–1902 гадах наведваў Гальшанскую народную школу, а наступныя чатыры гады — Ашмянскае гарадское вучылішча. У 1913 скончыў Віленскую духоўную каталіцкую семінарыю. У Вільні пасябраваў і праз усё жыццё захаваў пачуццё аднадумства з такімі вядомымі беларускімі каталіцкімі святарамі і дзеячамі, як Кастусь Стаповіч (Казімер Сваяк), Адам Станкевіч, Віктар Шутовіч, Андрэй Цікота, Вінцук Гадлеўскі і іншымі.

29.6.1913 пасвечаны ў святары, тады ж распачаў душпастырскую дзейнасць як вікарый у мясцовасці Далістова Беластоцкага павета. Пазней працаваў у розных парафіях Беластоцкага дэканата (Беласток, Крынкі, Мсцібова, Вялікая Лапеніца). У 1921 уступіў у Таварыства беларускай школы; арганізаваў адну з беларускіх школ, у касцёле гаварыў казанні на беларускай мове. Гэта выклікала незадаволенасць найвышэйшай іерархіі, і Адважны вымушаны быў пераехаць у Друю, дзе ў 1924 уступіў у ордэн марыянаў. Пачаткова выконваў абавязкі пробашча Друйскай парафіі, пазней быў магістрам навіцыяту і, акрамя таго, настаўнікам рэлігіі і лацінскай мовы ў Друйскай гімназіі. Шырока выступаў у беларускім перыядычным друку. Празаічныя і паэтычныя творы Адважнага рэгулярна з’яўляліся на старонках перыядычнага друку («Krynica», «Chryscijanskaja Dumka»). Пераследаваўся польскімі свецкімі і духоўнымі ўладамі. З 1932 на місіянерскай працы ў Харбіне (Маньчжурыя), дзе таксама быў

дырэктарам гімназіі. У 1936 вярнуўся ў Вільню, кіраваў Беларускім марыянскім домам студэнтаў. У 1938 дэпартаваны разам са студэнтамі ў Цэнтральную Польшчу, адкуль у хуткім часе зноў выехаў у Харбін. У 1948 арыштаваны кітайскай паліцыяй і перададзены савецкім органам бяспекі. Быў прысуджаны да 25 гадоў прымусовых работ у лагерах. Знаходзіўся ў зняволенні ў Сібіры. У 1955 г. вызвалены. Вярнуўшыся на волю, ён хацеў служыць Богу ў Беларусі, але замест гэтага мусіў знаходзіць часовы прыстанак спачатку ў Варшаве, потым у Рыме (1959 г.), пакуль урэшце не атабарыўся ў Беларускай каталіцкай місіі ў Лондане. Прымаў удзел у рэлігійным і культурным жыцці беларускага замежжа. Рэдагаваў часопіс «Божым шляхам» (Лондан).

Айцец Я. Германовіч пачаў друкавацца з 1919 году. Першы артыкул надрукаваў у віленскай «Крыніцы» пад назовай «Хто мы?», які падпісаў псеўданімам «Хлопчык з-пад Горадні». Праз нейкі час здарылася яму сустрэцца з вядомым беларускім пісьменнікам і літаратурным крытыкам Максімам Гарэцкім, які, як сведчыць у сваіх успамінах біскуп Часлаў Сіповіч, сказаў яму: «Ксёндз, ты мусіш пісаць! Грэх, калі не будзеш!» Такая падтрымка стала добрым стымулам для святара. Пяру беларускага святара-патрыёта належаць не толькі шматлікія артыкулы, вершы, замалёўкі ў заходнебеларускім друку, але і апавяданні ў прозе і вершы, аповесці ды байкі. Аднак творчасць Вінцука Адважнага сёння вядома, на жаль, толькі вузкаму колу даследчыкаў.

У міжваенны час у Вільні асобнымі кніжкамі выйшлі 9 разнастайных твораў Вінцука Адважнага. Першы з іх — апавяданне «Як Казюк сабраўся да споведзі» (1928). Затым былі: апавяданне «Казюкова жанімства» (1929), вершаваныя апавяданні «Як Гануля збіралася ў Аргентыну» і «Гануліны клопаты» (1930), апавяданне «Адам і Анэлька» (1931), «Канёк-Гарбунок» (1932), паэма «Унія на Палессі» (1932), «Батлейка» (1932), зборнік вершаў «Беларускія цымбалы» (1933), аповесць «Хлапец» (1936).

Шырокую вядомасць на Захадзе атрымалі лагерныя ўспаміны Язэпа Германовіча «Кітай-Сібір-Масква». Гэта была адна з першых кніг, якая раскрывала ўсю жудасць савецкай таталітарнай сістэмы. Кніга была выдадзена ў 1962 годзе ў Мюнхэне і перакладзена на некалькі моваў. На Бацькаўшчыне ж гэты

ды іншыя творы пісьменніка-святара да апошняга часу не выдаваліся, а імя яго не згадвалася ні ў падручніках, ні ў даведніках. У 1990-ыя гады некаторыя беларускія выданні пачалі друкаваць невялікія ўрыўкі з яго ўспамінаў і асобныя вершы. І толькі ў 2003 годзе грамадзкасць Беларусі ўпершыню змагла пазнаёміцца з адным з яго твораў — лагернымі ўспамінамі «Кітай-Сібір-Масква», якія былі надрукаваныя айцамі-марыянамі сумесна з выдавецтвам «Сафія» пры Полацкай грэка-каталіцкай грамадзе. Але і яны былі надрукаваны ў Расіі ў Санкт-Пецярбургскім выдавецтве «Неўскі прасцяг».

Жывучы на эміграцыі, Вінцук Адважны напісаў шмат арыгінальных баек, ім было зроблена нямала перакладаў з Крылова, Красіцкага ды іншых вядомых аўтараў. На жаль, частка гэтых твораў загінула (напрыклад, напісанае ў Харбіне там і засталося). У пасляваенны перыяд шматлікія байкі, вершы, вершаваныя інтэрпрэтацыі біблейскіх матываў, успаміны Язэпа Германовіча друкаваліся ў часопісах «Божым шляхам» і «Зніч». У Лондане выйшлі наступныя ягоныя творы: паэма «Князь і Лапаць» (1964), «Байкі і іншыя вершы» (1974), а ў Мюнхэне — «Прыповесці паводле Эвангелля Матэя-Марка-Лукі-Яна» (1970).

Як адзначаюць беларускія крытыкі, у творчасці Вінцука Адважнага моцна адчуваюцца ўплывы аднаго з пачынальнікаў беларускага адраджэння Францішка Багушэвіча. У ягоных творах, дзе часта разглядаюцца пытанні хрысціянскае маралі, шмат шчырасці, духоўнае чысціні і ўзнёсласці. Яны адзначаюцца шчырым беларускім патрыятызмам і гумарам. Творчасьць Вінцука Адважнага цалкам прасякнута хрысціянствам, і менавіта ў ім ён чэрпае натхненне. Ксёндз Адам Станкевіч так пісаў пра яго творчасьць: «...Справа народная ў В. Адважнага гэта частка справы Божай».

Памёр Вінцук Адважны 26 снежня 1978 г. у Лондане.

Бібліяграфія:

«Як Казюк сабраўся да споведзі», Вільня, 1928; «Казюковае жанімства», Вільня, 1929; «Як Ганулясобіралася ў Аргентыну», Вільня, 1930; «Адам і Анэлька», Вільня, 1931; «Канёк-Гарбунок» (паводле Яршова), Вільня, 1932; «Батлейка», Вільня, 1932; «Унія на Палессі», Альберцін, 1932; «Беларускія цымбалы», Вільня, 1933; «Казка аб рыбаку і рыбцы», Вільня, 1935; «Хлапец»,

Вільня, 1935; «Гануліны клопаты», Вільня, 1935; «Кітай-Сібір-Масква» (успаміны), Мюнхен, 1962; «Пакутныя псалмы» (пераклад вершаў), Рым, 1964; «Князь і лапаць. Сучасная казка», Лондан, 1964; «Байкі і іншыя вершы», Лондан, 1973.

Літаратура:


1. Беларускія рэлігійныя дзеячы XX ст.: Жыццярысы, мартыралогія, успаміны / уклад.: Ю. Гарбінскі. - Мн. - Мюнхен: Беларускі кнігазбор, 1999.
2. Ласкоў І. Шлях пакутніка: Па старонках адной малавядомай кнігі // ЛіМ, 9.2.1990.
3. Сачанка Б. Сняцца сны... С. 12—14
4. Станкевіч А. Аб жыцці і творчасці В.А. (Вінцука Адважнага) // W.A. Biełaruskija Cymbały. Wilnia, 1933
5. Туронак Ю. Язэп Германовіч – святар і пісьменнік // Наша вера. №1(2). 1996
6. Юрэвіч Л. Літаратурная спадчына: новы погляд // Беларус (Нью-Йорк). 1997. Жнівень
7. Маракоў Л.У. Рэпрэсаваныя літаратары, навукоўцы, работнікі асветы, грамадскія і культурныя дзеячы Беларусі, 1794-1991. Энц. даведнік. У 10 т. Т.1. —Мн:, 2003.
8. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 Т. Т.1. – Мн. 1993. – с. – 46.

**Арэхва Мікалай**



М. С. Арэхва.

Мікалай Сямёнавіч Арэхва (11 (24) лістапада 1902, в. Баруны Ашмянскага павета Віленскай губерні, цяпер Ашмянскі раён Гродзенскай вобласці — 16 ліпеня 1990, Мінск; парт. псеўд.: Пётр, Клышка-Маліноўскі, Мікуліч, Барысевіч) — дзеяч рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, гісторык.

Удзельнік грамадзянскай (ваяваў супраць войск Юдзеніча) і польска-савецкай войнаў. У пачатку 1920-х сакратар Наўгародскага павятовага і губернскага камітэтаў РКСМ. З верасня 1923 у апараце ЦК РКСМ. У 1924 старшыня Часовага Беларускага Бюро ЦК РКСМ, абраны першым сакратаром ЦК КСМБ. Член ЦВК БССР (1924). Са студзеня 1925 на падпольнай рабоце ў Заходняй Беларусі: сакратар Віленскага акруговага камітэта, член ЦК КПЗБ. У сакавіку 1926 арыштаваны польскай дэфензівай. 5 гадоў знаходзіўся ў турмах Польшчы. У 1934—1935 узначальваў Краявы сакратарыят ЦК КПЗБ. Дэлегат III канферэнцыі (1926), II з’езда (1935), VII кангрэса (1935) Камінтэрна. З мая 1935 член Бюро, з ліпеня 1936 прадстаўнік ЦК КПЗБ пры арганізацыйным апараце ЦК Кампартыі Польшчы ў Празе. Са снежня 1939 жыў у СССР. У час 2-й сусветнай вайны ў Войску Польскім. З 1945 у апараце Міністэрства грамадскай бяспекі Польскай Народнай Рэспублікі (ПНР). З 1956 у Мінску, у Інстытуце гісторыі партыі пры ЦК КПБ, у якім працаваў старшым навуковым супрацоўнікам да 1984.

Аўтар шматлікіх публікацый па гісторыі рэвалюцыйнага нацыянальна-вызваленчага руху, Камуністычнай партыі і камсамола. Адзін з аўтараў калектыўнай працы «Рэвалюцыйны шлях Кампартыі Заходняй Беларусі (1921—1939 гг.)» (Мн., 1966), складальнік і рэдактар зборнікаў дакументаў і матэрыялаў «Барацьба працоўных Заходняй Беларусі за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне і ўз'яднанне з БССР» (т. 1—2, Мн., 1962—1972), зборнікаў успамінаў

«У суровыя гады падполля» (Мн., 1958), «Гады выпрабаванняў і мужнасці» (Мн., 1973) і інш.

Заслужаны работнік культуры БССР (1981).

Літаратура:


1. Маракоў Л.У. Рэпрэсаваныя літаратары, навукоўцы, работнікі асветы, грамадскія і культурныя дзеячы Беларусі, 1794-1991. Энц. даведнік. У 10 т. Т.3. Кн.1. —Мн:, 2003.
2. Мяснікоў А. Маладосць вяла наперад // Чырвоная змена. 1977. 26 ліст.;
3. Тоўсцік А. Разамназаўсёды // Чырвоная змена. 1979. 16 вер.;
4. Міско Я. Таварыш «Пётр» // Полымя. 1982. № 2. С. 162—172;
5. Соколова И. Посеянное в людях отзовется… // Полит. собеседник. 1987. № 5. С. 21—23;
6. Раманоўскі В. Праз усё жыццё // Вяч. Мінск. 1989. 9 ліст.;
7. Бараноўскі Я. «Паколькі мая жонка ўжо сама апраўдвацца і абараняцца не можа…» // Звязда. 1996. 4 крас.;
8. Пяткевіч А. М. Людзі культуры з Гродзеншчыны: Даведнік. Гродна: ГрДУ, 2000. С. – 18.
9. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 Т. Т.1. – Мн. 1993. – с. – 201.


**Батурын Аляксандр**



На выпускным экзамене ў Петраградскай кансерваторыі ў 1924 г. рэктар Аляксандр Глазуноў робіць запіс: “Цудоўны голас прыгожага тэмбру, моцны і сакавіты. Ярка таленавіты. Ясная дыкцыя. Пластычная дэкламацыя. 5+ (пяць з плюсам)”.

Менавіта з гэтай рэкамендацыі пачынаецца трыумфальны шлях беднага хлопца з Ашмянаў на вялікую сцэну. Нарком асветы Анатоль Луначарскі,

пазнаёміўшыся з ацэнкай знакамітага кампазітара, накіраваў маладога спевака для ўдасканалення ў Рым.

Аляксандр Батурын нарадзіўся ў Ашмянах у сям'і сельскага настаўніка. Бацька памёр, калі яму споўніўся год. На руках у маці, акрамя маленькага Сашы, было яшчэ трое дзяцей, і сям'я жыла ў вялікай беднасці.

У 1911 г. ў Адэсе, каб дапамагчы маці, будучы спявак пачынае працаваць у гаражы. Возячыся ля матора, любіў пець. Вакол яго часта збіраліся калегі, з захапленнем слухалі песні. Па просьбе сяброў Аляксандр выступае на вечары самадзейнасці ў гаражы. Поспех быў грандыёзны: ад саюза транспартных рабочых ён атрымлівае накіраванне на вучобу ў Петраградскую кансерваторыю.

Паслухаўшы песні Батурына, Аляксандр Глазуноў, рэктар кансерваторыі, сказаў: “Батурын валодае выдатным па прыгажосці, сіле і аб'ёме голасам цёплага і сакавітага тэмбру…” Пасля ўступных экзаменаў спевака прымаюць у клас прафесара Тартакова. Кансерваторыю ён закончыў з адзнакай.

У час вучобы ў Рыме Аляксандр паступіў у музычную акадэмію “Санта Чэчылія”. У міланскім тэатры “Ла Скала” малады спявак выступаў у операх “Дон Карлосе”, “Басцьен і Басцьена”, іншых.

У гэты час ён гастраляваў па Еўропе. Францыя, Бельгія, Германія апладзіравалі яго таленту, а ён марыў хоць адзін раз выступіць у горадзе свайго дзяцінства. На жаль, гэта яго мара так і не ажыццявілася.

У 1927 г. спевака залічылі салістам у Вялікі тэатр у Маскве. Там ён да 1958 г. выканаў на сцэне шмат роляў. Пеў басовыя і барытонавыя партыі. У яго рэпертуар уваходзілі таксама народныя песні і камерныя партыі. З цікавасцю выконваў спявак творы сучасных кампазітараў.

У гады Вялікай Айчыннай вайны, калі Вялікі тэатр знаходзіўся ў эвакуацыі, у Куйбышаве, на яго сцэне з поспехам прайшла опера Расіні “Вільгельм Тэль”. Аляксандр Іосіфавіч, які выконваў галоўную партыю, у 1943 г. атрымаў за яе сталінскую прэмію і ўсе 100 тысяч рублёў перадаў на патрэбы фронту: за гэтыя грошы былі пабудаваныя самалёты. Зняўся таксама Аляксандр Батурын у кінафільмах “Просты выпадак”, “Канцэрт-вальс” і “Зямля”.

Пасля вайны ў Маскоўскай кансерваторыі ён вёў клас сольных спеваў і падрыхтаваў навуковую працу “Школа спеваў”, у якой адлюстраваў свой багаты вопыт і даў падрабязнае апісанне прыёмаў навучання спевам.

Памёр спявак у 1983 г. і пахаваны на Кунцаўскіх могілках у Маскве. На жаль, на сваю малую радзіму ён так больш ніколі і не прыязджаў. Але тут яго памятаюць. Магчыма, у адным з новых мікрараёнаў Ашмянаў хутка з’явіцца вуліца імя Аляксандра Батурына?

Літаратура:

1. www.intos la ssics.net
2. Пяткевіч А. М. Людзі культуры з Гродзеншчыны: Даведнік. Гродна: ГрДУ, 2000. С. – 26.

**Вярсоцкі Янка**

Янка Вярсоцкі (17.2.1888, мяст. Гальшаны Ашмянскага павета Віленскай губерні, цяпер Ашмянскі раён Гродзенскай вобласці — 22.12.1937, Алма-Ата, НКВД), беларускі рыма-каталіцкі святар, грамадскі дзеяч.

У 1904-1908 вучыўся ў Ашмянскім гарадскім 3-класным вучылішчы. 6.4.1909 паспяхова здаў экзамен на званне аптэкарскага вучня пры экзаменацыйнай камісіі Пецярбургскай навучальнай акругі. У 1910-1915 вучыўся ў Магілёўскай духоўнай каталіцкай семінарыі ў Пецярбургу. Падчас вучобы наведваў культурна-асветны гурток беларускіх студэнтаў-клерыкаў. У 1915 пасвечаны ў святары. Служыў вікарыем парафій св. Тройцы ў Мінску і Смаленску. Удзельнік 1-га з'езда беларускага каталіцкага духавенства (Мінск, 24-25.5.1917). Член Саюза ксяндзоў-беларусаў. З 1919 адміністратар парафіі Забелы Дрыса-Себежскага дэканата Віцебскай губ. 8.8.1927 арыштаваны АДПУ. Прыгавораны да 3 гадоў лагераў. З 1.1.1928 — на Салаўках. Пасля сканчэння тэрміну зняволення зноў арыштаваны і высланы ў Алма-Ату (Казахстан). У высылцы арыштаваны чарговы раз; 11.12.1937 прыгавораны да смяротнага пакарання. Расстраляны ў турме НКВД.

Літаратура:

1. Маракоў Л.У. Рэпрэсаваныя літаратары, навукоўцы, работнікі асветы, грамадскія і культурныя дзеячы Беларусі, 1794-1991. Энц. даведнік. У 10 т. Т.1. —Мн:, 2003.
2. http://be.wikipedia.org/wiki/%D0%AF%D0%BD%D0%BA%D0%B0_%D0%92%D1%8F%D1%80%D1%81%D0%BE%D1%86%D0%BA%D1%96

**Жалігоўскі Люцыян**



Жалiго́ўскі Люцыя́н (17 кастрычніка 1865 — 9 ліпеня 1947) — польскі вайсковы і палітычны дзяяч, генерал. Удзельнік польска-савецкай вайны 1919-1920 г.: дывізія пад яго камандаваннем захапіла Вільню і Віленскі край. У 1925-1926 г. ваенны міністр, у 1927-1939 г. дэпутат польскага сейма.

Нарадзіўся ў Ашмянах. Бацька — удзельнік паўстання 1863 — 1864 гг. Густаў Жалігоўскі; маці Ўладзіслава Трачэўская. Жонка Люцыяна Жалігоўскага, руская па паходжанні Таццяна Пятроўна Жалігоўская; дзеці двайняты Яніна і Тадэвуш. Скончыў гімназію ў Вільні і афіцэрскую школу ў Рызе.

З 1885 г. — кадравы афіцэр расійскага войска. Удзельнічаў у Руска-японскай вайне 1904—1905 гг. Падчас Першай сусветнай вайны ў званні палкоўніка камандаваў пяхотным палком, потым дывізіяй. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі стаў адным з арганізатараў польскіх нацыянальных частак у Расіі. Камандаваў брыгадай у 1-м Польскім корпусе. У 1918—1919 гг. — камандзір сфармаванай на Кубані (на тэрыторыі занятай Дзянікіным) так званай Дывізіі Жалігоўскага і галоўнакамандуючы польскіх атрадаў на Ўсходзе. У красавіку 1919 г. праз Адэсу і Бесарабію дывізія Жалігоўскага была перавезена ў Польшчу, дзе ён стаў на чале 4-й дывізіі польскіх стралкоў. У польскім войску стаў спачатку камандуючым Літоўска-беларускага фронта, затым — у 1919 г. камандаваў Мазырскай

аператыўнай групай, затым 10-й пяхотнай дывізіяй (1919 г.), падчас савецка-польскай вайны. З кастрычніка 1920 камандзір 1-й Літоўска-беларускай дывізіі. Узначаліў літоўска-беларускія часткі (галоўным чынам сфармаваных з выхадцаў Вільні і Віленскага краю), якія адмовіліся падпарадкоўвацца Варшаве ў паходзе на Вільню. Падначаленыя яму войскі занялі Вільню (9 кастрычніка 1920) і Віленскі край.

Размешчаныя ў 50 км ад Вільні часткі занялі горад 9 кастрычніка. Увечар таго ж дня Жалігоўскі радыёграмай, адрасаванай урадам Польшчы, ЗША, іншых дзяржаў і Ліге Нацый, апавясціў пра тое, што салдаты родам з Віленскага краю адмовіліся падпарадкоўвацца Вярхоўнаму галоўнакамандуючаму, ён прыняў камандаванне над імі і створана часовая выканаўчая камісія. Адначасова быў выпушчаны зварот салдатаў I Літоўска-Беларускай дывізіі, у якім аб'яўлялася, што пакуль хоць адзін з іх у стане трымаць у руках зброю, магілы продкаў не захопіць «літовец, бальшавік ці немец», а «ангелічанін» не будзе вырашаць іх лёс. Пра стварэнне Сярэдняй Літвы паведамлялі тры ноты, высланыя 12 кастрычніка 1920 генералам Л. Жалігоўскім ураду Польшчы ў Варшаве, ураду Літвы ў Коўне і дзяржавам Антанты.

На занятых тэрыторыях была ўтворана самастойная дзяржава — Сярэдняя Літва, дзе 12 кастрычніка Л. Жалігоўскі абвясціў сябе вярхоўным кіраўніком створанай ім дзяржавы.

Выдадзены Л. Жалігоўскім дэкрэт № 1 ад 12 кастрычніка 1920 усталёўваў тэрыторыю Сярэдняй Літвы ў межах, вызначаных савецка-літоўскім дагаворам 12 ліпеня 1920, і літоўска-польскай дэмаркацыйнай лініяй чэрвеня 1920. Такім чынам Сярэдняя Літва прэтэндавала на Шырвінты і Высокі Двор (Аукштадварыс) на тэрыторыі ковенскай Літвы і Ліду, Васілішкі і Браслаў, якія апынуліся ў складзе Польшчы. Тэрыторыя Сярэдняй Літвы займала частку земляў ашмянскага, свенцянскага, віленскага паветаў і тры гміны троцкага павета, усяго 13 014 км?.

У 1920 - 1922 гг. галоўнакамандуючы войскамі Сярэдняй Літвы. 1921.11.30 Л.Жалігоўскі прыняў Дэкрэт пра правядзенне ў студзені 1922 г. выбараў у

Віленскі сойм, плебісцыту па пытанні далучэння Сярэдняй Літвы (Віленская вобласць) да Польшчы на правах аўтаноміі і пра перадачу ўлады ў Сярэдняй Літве А. Мештовічу. Пасля плебісцыта і ўваходжанні Сярэдняй Літвы ў склад заходнебеларускіх земляў польскай дзяржавы (1922.03.24) інспектар войска ў Варшаве (1921—1925), затым ваенны міністр (1925—1926). Забяспечыў ажыццяўленне травеньскага перавароту 1926 у Польшчы, які ўсталяваў аўтарытарны рэжым Пілсудскага. Дружалюбны яму ваенны міністр Жаліхоўскі пад выглядам планавых вучэнняў засяродзіў пад Варшавай адборныя часці, і перадаў камандаванне над імі Пілсудскаму.

12 траўня 1926 г. войскі Пілсудскага рушылі на Варшаву. Міністр абароны Люцыян Жалігоўскі, загадзя расставіў патрэбных людзей на чале ваенных акруг, акружыўшы праўрадавыя гарнізоны. Аднак кансерватыўныя генералы ўсё ж арганізавалі супраціў. 13 траўня ў Варшаве разгарнуліся разлютаваныя вулічныя баі.

У 1927 выйшаў у адстаўку. У 1930 выдаў кнігу «Вайна ў 1920 году. Успаміны і развaжанні». У 1935 быў абраны ў Сойм і заставаўся членам польскага парламента да 1939.

З пачаткам германскай агрэсіі ў 1939 паспрабаваў уступіць добраахвотнікам на ваенную службу, але прыняты не быў з-за старэчага ўзросту. Прымаў удзел у камандаванні Паўднёвым фронтам. У 1939 г. выехаў у Францыю, у 1940 — у Вялікабрытанію.

Быў членам польскага ўрада ў выгнанні. Па завяршэнні Другой сусветнай вайны заявіў пра намер вярнуцца ў Польшчу. Пры падрыхтоўцы да ад'езду памёр у Лондане. Па завяшчанні прах быў прывезены ў Варшаву і пахаваны на ваенных могілках Павонзкі. Транспартаванне арганізаваў брыгадны генерал Станіслаў Татараў.

Ганаровы грамадзянін Варшавы (кастрычнік 1920)

Літаратура:

1. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 Т. Т.3. – Мн. 1996. – с. – 363.

2. http://be.wikipedia.org/wiki/%D0%9B%D1%8E%D1%86%D1%8B%D1%8F%D0%BD_%D0%96%D0%B0%D0%BB%D1%96%D0%B3%D0%BE%D1%9E%D1%81%D0%BA%D1%96

**Карчэўскі Юльян**

Юльян Карчэўскі нарадзіўся ў снежні 1806 г. у Гальшанах, у сям’і адваката Юзафа Карчэўскага. Хлопчык вучыўся ў Віленскай Гімназіі, а потым па патрабаванні бацькі паступіў у Віленскі ўніверсітэт на юрыдычны факультэт. Ужо тады малады чалавек стаў наведваць урокі малявання ў майстэрні Яна Рустэма.

У 1824 г. Юльян з'ехаў у Пецярбург, дзе працягваў сваю юрыдычную адукацыю ва ўніверсітэце. І, вядома ж, ён працягваў заняткі жывапісам. Шмат працуе ў Эрмітажы — вывучае жывапіс вядомых мастакоў. Юльян стаў браць урокі ў акадэміка Акадэміі мастацтваў Аляксандра Юззфавіча Арлоўскага (1777 — 1832 гг.). Цікавы той факт, што і Арлоўскі, і Рустэм былі вучнямі жывапісца Норбліна. Асноўныя сюжэты іх твораў — жанравыя сцэны з жыцця мясцовых жыхароў. І Юльян Карчэўскі таксама напісаў некалькі карцін у гэтым жанры: "Руская хуткая пошта", "Габрайскія хаўтуры", "Габрайская карчма", "Габраі ў дарозе", "Пастой". Па словах Ю. Вільчынскага, творы Юльяна адрозніваліся "…сваім адмысловым каларытам і кампазіцыяй…Яны (карціны) былі напісаныя шырокім і адважным пэндзлем…".

У 1826 г. Юльян скончыў Віленскі Ўніверсітэт і атрымаў ступень "Кандыдат права", пасля чаго бацька адправіў яго за мяжу. Спачатку малады чалавек паехаў у Парыж, не забыўшыся па дарозе наведаць Амстэрдам і Дрэздэн.

У Парыжы настаўнікамі Юльяна сталі вядомыя мастакі: акадэмік Орас Верге (1789 — 1863 гг.) і барон Антоній Жан Гросс (1771 — 1835 гг.). Першы быў недасягальным майстрам малявання коней, а другі - пісаў батальныя сцэны напалеонаўскай вайны. Юльян наведваў Луўр і пісаў копіі карцін вядомых майстроў, а потым высылаў іх бацьку ў Бянюны. Пад уплывам сваіх настаўнікаў Карчэўскі напісаў: "Ян Сабескі пад Венай" і "Турак на кані".

У 1829 г. Юльян наведаў Лондан, а затым адправіўся ў Італію, услед за сваім настаўнікам Орасам Верге. У Рыме Карчэўскі наведваў заняткі ў Акадэміі

майстацтваў. У вечным горадзе Юльян пазнаёміўся з Адамам Міцкевічам і іншымі выгнаннікамі з Радзімы. Пад уплывам вялікага паэта Юльян Карчэўскі захапіўся гістарычным жанрам і напісаў некалькі палотнаў. У 1830 г. у Рыме праходзіла мастацкая выстава, дзе Карчэўскі выставіў свае працы. Поспех быў ашаламляльны — крытыкі хвалілі яго. А некалькі ангельцаў выкупілі яго працы ў прыватныя калекцыі.

Але Юльян захварэў сухотамі і ў студзені 1833 г. памёр у Рыме, дзе і быў пахаваны. Час не пашкадаваў твораў Юльяна Карчэўскага. Вядома, што ў XIX ст. яго карціны "Ян Сабескі пад Венай" і "Турак на кані" захоўваліся ў галерэі А. Храптовіча ў Шчорсах, а "Маці Божая" — у калекцыі Томаша Зана. Цяперака ў Нацыянальным музеі ў Варшаве захаваліся дзве карціны Карчэўскага: "Габрайская пошта" і “Партрэт Якава Брыале”…

Літаратура:


1. Пяткевіч А. М. Людзі культуры з Гродзеншчыны: Даведнік. Гродна: ГрДУ, 2000. С. – 138.
2. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Ашмянскага раёна. — Мн.: БЕЛТА, 2003. — с 139 — 140.


**Клінцэвіч Франц Адамавіч**



Дэпутат Дзяржаўнай Думы Федэральнага Збору РФ пятага склікання са снежня 2007 г., член фракцыі "Единая Россия", першы намеснік старшыні Камітэта па справах ветэранаў; дэпутат Дзяржаўнай Думы РФ трэцяга (1999-2003) і чацвёртага (2003-2007) скліканняў; старшыня кіравання Расійскага саюза ветэранаў Афганістана (РСВА); нарадзіўся 15 чэрвеня 1957 г. у в. Крыванцы Ашмянскага раёна Гарадзенскай вобласці (Беларусь), беларус; скончыў Свярдлоўскае вышэйшае ваенна-палітычнае танка-артылерыйскае вучылішча ў 1980 г., дзесяцімесячныя курсы афіцэраў-палітпрацаўнікоў па замежнай мове пры Ваенным інстытуце замежных моў з прысваеннем

кваліфікацыі перакладчыка па мове дары ў 1986 г., Ваенна-Палітычную акадэмію ім.У. І. Леніна ў 1991 г.; Ваенную акадэмію Генеральнага штаба Ўзброеных Сіл РФ у 2004 г., кандыдат псіхалагічных навук (тэма дысертацыі — "Личностно-психологические особенности россиян с низким и высоким уровнями дохода"); працоўную дзейнасць пачаў настаўнікам чарчэння, працы і фізкультуры ў Крыванцэўскай сельскай 8-гадовай школе (1974-1975); з 1975 г. па 1997 г. служыў у шэрагах Узброеных Сіл СССР і РФ, службу праходзіў у Паветрана-дэсантных войсках на розных пасадах,1986-1988 — у 345-м асобным парашутна-дэсантным палку 40-й арміі ў Афганістане, удзельнічаў у баявых дзеяннях; палкоўнік запасу; 1990-1994 - намеснік старшыні Саюза ветэранаў Афганістана; з 1994 г. - старшыня кіравання Расійскага саюза ветэранаў Афганістана; 17 снежня 1995 г. балатаваўся ў Дзяржаўную Думу другога склікання па спісе блока "За Родину!", не пераадолеў 5-% бар'ер; 19 снежня 1999 г. абраны дэпутатам Дзяржаўнай Думы РФ трэцяга склікання быў абраны па федэральным спісе выбарчага блока "Межрегиональное движение "Единство" (МЕДВЕДЬ)"; у Дзяржаўнай Думе таксама прызначаўся членам Камісіі па аказанні садзейнічання Саюзнай Рэспублiцы Югаславii ў пераадоленні наступстваў агрэсіі НАТО, намеснікам старшыні Камісіі па садзейнічанні нармалізацыі грамадска-палітычнага і сацыяльна-эканамічнага становішча і выкананню праў чалавека ў Чачэнскай Рэспубліцы; 7 снежня 2003 г. быў абраны ў Дзяржаўную Думу РФ чацвёртага склікання па федэральным спісе выбарчага аб'яднання Партыя, "Единство" и "Отечество" — Единая Россия быў намеснікам кіраўніка фракцыі "Единая Россия", членам Камітэта па абароне; 2 снежня 2007 г. абраны дэпутатам Дзяржаўнай Думы РФ пятага склікання ў складзе федэральнага спісу кандыдатаў, вылучанага Ўсерасійскай палітычнай партыяй "Единая Россия"; абіраўся членам Рады Агульнарасійскага грамадскага руху "Реформы — новый курс" (1995); старшыня Народна-патрыятычнай партыі з 1999 г.; у верасні 2000 г. быў абраны старшынёй Маскоўскай гарадской арганізацыі "Единство"; 3 красавіка 2001 г. на прэзідыуме палітрады партыі "Единство" быў абраны і. о. старшыні ў сувязі са складаннем паўнамоцтваў Б. Грызловым, прызначаным міністрам унутраных спраў; член Рады па ўзаемадзеянні з грамадскімі аб'яднаннямі ветэранаў, афіцэраў

запасу і ў адстаўцы пры Прэзідэнце РФ; віцэ-прэзідэнт арганізацыі "Боевое братство"; 1 снежня 2001 г. на ўстаноўчым з'ездзе ўсерасійскай партыі "Единая Россия" ("Единство и Отечество") быў абраны членам яе Генеральнай рады, займаецца пытаннямі партыйнага будаўніцтва; узнагароджаны двума ордэнамі "Красной звезды" (1987, 1988), ордэнам "Почета" (1999), ордэнам "Почета" Рэспублікі Беларусь (1999), ордэнам "Звезда" III ступені Рэспублікі Афганістан (1987), 12 медалямі СССР і Рэспублікі Афганістан; валодае мовай дары, беларускай, польскай і нямецкай мовамі; жанаты, мае сына і дачку; захапляецца тэнісам.

Літаратура:

1. Большая биографическая энциклопедия. 2009.
2. academic.ru

**Марціновіч Віктар**



Віктар Марціновіч (нар. 1977, Ашмяны) — беларускі публіцыст, мастацтвазанаўца, пісьменьнік.

Намеснік рэдактара «Белгазеты». Выкладчык гісторыі мастацтва ў ЭГУ.

27 чэрвеня 2008 абараніў доктарскую дэсертацыю ў Віленскай Акадэміі Мастацтваў на тэму: «Віцебскі авангард (1918 — 1922): сацыякультурны кантэкст і мастацкая крытыка».

Выдаў раман «Параноя» на рускай мове ў 2009 годзе, які быў негалосна забаронены да продажу ў Мінску і на інтэрнэт-кнігарні oz.by.

Раман "Параноя" распавядае аб краіне, падобнай да Беларусі, і горадзе, падобным да Мінска. Ёсць там і пра дыктатуру, і пра чалавечыя адносіны... Шмат хто знайшоў у кнізе Марціновіча падабенства з оруэлаўскім "1984".

“Мне здаецца, што былі нейкія кнігі, якія забараняліся і дагэтуль. Калі мы кажам пра кнігу Аляксандра Фядуты “Аляксандар Лукашэнка. Палітычная біяграфія”, дык кніжка з партрэтам Лукашэнкі на вокладцы проста павінна быць

забароненая ў такой краіне, як Беларусь. Але калі мы кажам пра раман, усё дзеянне якога з'яўляецца фантазмам, зяўляецца фікцыяй, забарона яго з'яўляецца нейкім дзікунствам. Забараняць гэты раман — гэта тое ж самае, што забараняць і саджаць у турму Джонатана Свіфта не за ягоныя памфлеты, а за "Падарожжа Гулівера". Тут жа ідзе гаворка пра твор, які з пачатку і да канца з'яўляецца вынікам працы маёй фантазіі" — Віктар Марціновіч у інтэр'ю з Інай Студзінскай.

Літаратура:

1. "Наша Ніва" №5 — 1 снежня 2009 г.

**Мінейка Зыгмунт**



Зыгмунт Станіслававіч Мінейка-Газдава (псеўданім Баравы; 1840, Балванішкі, Ашмянскі павет, Віленская губерня, цяпер Зялёны Бор, Ашмянскі раён, Гродзенская вобласць — 27 снежня 1925, Атэны, Грэцыя) — грамадзскі дзеяч, інжынер, аматар гісторыі, вайсковец, навуковец, рэвалюцыянер, удзельнік паўстання 1863-1864. З шляхецкага роду Мінейкаў гербу Газдава, сын Станіслава і Цацыліі са Шчановічаў.

Вучыўся ў Віленскай гімназіі ў 1858 паступіў у Вайсковую Акадэмію ў Санкт-Пецярбургу. Па вяртанні на Беларусь далучыўся да вызваленчага руху. Пераапрануўшыся селянінам, разносіў па вёсках «Гутарку старога дзеда». Быў змушаны выехаць у Італію, ад 1861 выкладаў правілы фартыфікацыі ў Вайсковай Школе ў Генуі (заснаваная Джузэпэ Гарыбальдзі). З пачаткам паўстання ў 1863 вярнуўся дадому. 18 сакавіка 1863 пад кіраўніцтвам Мар'яна Лянгевіча ўзяў удзел у бітве пад Граховішкамі. Хоць бітва была выйграная, кампанія была няўдалая. Праз Прусію Зыгмунт зноў прыбыў на Беларусь, дзе арганізаваў аддзел з 28 партызанаў. Паўстанцкі ваенны начальнік Ашмянскага павету. Але аддзел у

першым ж баі 3 чэрвеня 1863 з расейскімі рэгулярнымі войскамі ля Расолішкаў быў разбіты. Зыгмунт мусіў хавацца. Ён быў арыштаваны і пасаджаны ў віленскі астрог. Суд прыгаварыў яго да павешання. Але Весялецкі і Мураўёў, падкупленыя 9000-мі рублёў маці Зыгмунта Цацыліяй, замянілі павешанне на 12 гадоў катаргі ў Сібіры.

На шляху паміж Табольскам і Томскам, памёр сябар Зыгмунта Струміла, які меў найменшы тэрмін адбыцця і быў звонку вельмі падобны да яго. Скарыстаўшыся гэтым, Мінейка выдаў сябе за Струмілу і застаўся ў Томску як вольны пасяленец. Тут ён пачаў гандляваць, выробляючы шапкі, падушкі і штучныя кветкі, а неўзабаве пачаў аздабляць дамы гораду. Набыўшы на зробленыя грошы вазы, коняў і правіянт, Зыгмунт разам з вязнямі Акінчыцам і Вашкевічам уцёк у Заходнюю Еўропу, узяўшы прозвішча графа фон Мэбэрта.

Спачатку жыў у Галандыі, адкуль перабраўся ў Парыж. Тут ён сустрэўся з імператарам Напалеонам III, якому расказаў пра французаў-удзельнікаў паўстання 1863, што адбывалі пакаранне ў Сібіры. Пасля сустрэчы ў 1868 Напалеона III і Аляксандра II вязні былі вызваленыя, а Мінейка атрымаў ва ўзнагароду магчымасць дармовага навучання ў Вайсковай Акадэміі. Будаваў масты і чыгункі ў Балгарыі, Турэччыне і Грэцыі. У 1870 удзельнічаў у франка-прускай вайне, пасля ў часе Парыскае Камуны змагаўся на баку камунараў. Пасля перабраўся ў Турэччыну, а адтуль у Грэцыю.

У 1880 ажаніўся з Празэрпінай Манарыс, дачкой дырэктара гімназіі ў Яніне. Меў 9 дзяцей: Андрамаху (жонка Караля Патоцкага), Соф'ю (жонка будучага прэм’ер-міністра Грэцыі Георгіяса Папандрэў), Станіслава, Марыю, Ядзьвігу (жонка Станіслава Ябланоўскага), Вітольда (памёр малым падчас землятрасення), Цацылію (жонка Джона Ўільяма Куїна), Альдону Сафо, Эўтыміяса Касіміра. Праўнукам Зыгмунта Мінейкі з’яўляецца вядомы грэчыскі палітык, кіраўнік Усягрэчыскага сацыялістычнага руху, Георгіяс Папандрэу-малодшы.

Займаўся археалогіяй, у 1878 знайшоў храм Зеўса ў Дадоне. Склаў этналагічную карту Эпіру, напісаў шматлікія работы па тапаграфіі, за што грэцкі парламент у 1910 надаў яму званне ганаровага грамадзяніна краіны. У 1891 пераехаў у Атэны, дзе ўзначаліў дэпартамент пры міністэрстве публічных работ

Грэцыі. Дакладна вядома, што ўдзельнічаў у будаўніцтве і ўзнаўленні алімпійскіх аб'ектаў, у тым ліку легендарнага Мармуровага стадыёна — сымбаля Алімпійскіх гульняў. У 1896 падчас Алімпіяды ў Атэнах быў спартыўным карэспандэнтам «Dziennika Polskiego» і «Czasu».

Удзельнічаў у грэка-турэцкіх войнах у 1896, 1897 і 1912, падрыхтаваў планы здабыцця Салонікаў і Яміны. Падчас Балканскай вайны 1912-1913 гг. Зыгмунт удзельнічаў у баях за Крыт. Менавіта ён арганізаваў захоп турэцкай крэпасці Яміна — адну з найбуйнейшых перамог грэкаў. Гэтая аперацыя прынесла нашаму суайчынніку вялікую славу і званне ганаровага грамадзяніна Грэцыі. Атрымаў узнагароды ад караля Канстанціна І у 1917 і 1922 (у т.л. і Залаты крыж заслугі). Працаваў у дзяржаўнай адміністрацыі, быў кіраўніком інжынернага аддзелу грэчыскай арміі.

У 1921 і 1922 наведаў Беларусь.

Быў актыўным масонскім дзеячам. Уваходзіў у склад ложаў Grand Orient de France, Grand Orient d'Italie і ложаў Panhellenion і Pythagoras (належылі да Grande Loge de Grece). Уваходзіў у кіраўніцтва грэцкіх ложаў Massonic Old and Accepted Scottish Rites. На ягонае пахаванне прыбыло шмат масонаў.

Яго імем у 2008 годзе названа адна з вуліц Паўднёвага мікрараёна Ашмян.

Літаратура:


1. Клейн Б. Фамильный портрет // Клейн Б. Время выбора. — Мн., 1987;
2. Орлов В. Почетный гражданин Эллады // Дело (Восток + Запад). 1995, № 5;
3. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т.Т. 5: М — Пуд / Беларус. Энцыкл.; Рэдкал.: Г. П. Пашкоў (галоўны рэд.) і інш.; Маст. Э. Э. Жакевіч. — Мн.: БелЭн, 1999. — 145 с.
4. Маракоў Л.У. Рэпрэсаваныя літаратары, навукоўцы, работнікі асветы, грамадскія і культурныя дзеячы Беларусі, 1794-1991. Энц. даведнік. У 10 т. Т.2.
5. Ашмянскі веснік. – 2010. – 24 лістапада. – с. – 5.
6. Пяткевіч А. М. Людзі культуры з Гродзеншчыны: Даведнік. Гродна: ГрДУ, 2000. С. – 211.

**Шукелойць Антон**



Шукелойць Антон (19.07.1915, в. Якелеўшчына Ашмянскага павета, Віленскай губерні, цяпер Ашмянскі раён Гродзенскай вобласці), беларускі грамадскі дзеяч у ЗША.

А. Шукелойць нарадзіўся ў сялянскай сям'і Антона і Бенядзікты з Пецюкевічаў. Бацька меў гаспадарку і гандляваў лесам. Скончыўшы Жупранскую пачатковую школу, хлопчык паступіў у Ашмянскую польскую гімназію. У 1935 г. стаў студэнтам аддзялення славянскай філалогіі і этнаграфіі гуманістычнага факультэта Віленскага універсітэта, які закончыў у 1939 г. Спецыялізаваўся ў вывучэнні народнага ткацтва, вопраткі беларусаў. Будучы студэнтам, працаваў ва універсітэцкім этнаграфічным музеі, часта выязджаў для збору матэрыялаў у розныя мясціны Беларусі.

Юнак рана далучыўся да грамадскага руху. Яшчэ ў гімназіі ён належаў да беларускага гуртка сацыялістычнай моладзі, якім кіраваў вядомы ашмянскі сацыялістычны дзеяч адвакат Аляксандр Барановіч. А ў Вільні далучыўся да групы студэнтаў, якая выдавала часопіс беларускай сацыялістычнай думкі «Золак», ідэалагічна набліжаны да эсэраў. Ва універсітэце быў сябрам беларускіх студэнцкіх арганізацый: Беларускага студэнцкага саюза, Таварыства прыяцеляў беларусаведы (у апошнім старшынстваваў). Спяваў у беларускім студэнцкім хоры пад кіраўніцтвам Рыгора Шырмы.

Па далучэнню Заходняй Беларусі да БССР у 1939 г. А. Шукелойць працаваў у школьніцтве на роднай Ашмяншчыне: арганізаваў у раённым цэнтры першую беларускую сярэднюю школу, настаўніцкія курсы і каля 90 беларускіх школ на тэрыторыі былога павета. Выкладаў беларускую мову ў гімназіі, дзе раней вучыўся сам. У 1940 г. стаў дэпутатам Ашмянскага гарадскога савета, загадчыкам гарадскога аддзела народнай асветы і школьным інспектарам-метадыстам Ашмянскага раёна. На другі дзень савецка-нямецкай вайны быў арыштаваны органамі НКУС. Вызваліўся з турмы ў выніку налёту нямецкай авіяцыі. У часы нацысцкай акупацыі працаваў у аддзеле асветы і культуры Мінскай гарадской управы, дзе ўпарадкоўваў архівы ЗАГСа, часткова знішчаныя ў выніку ваенных

дзеянняў. Затым стаў загадчыкам Беларускага гістарычнага музея (потым Краязнаўчы музей). Пасля арганізацыі ў Мінску Беларускага культурнага таварыства А. Шукелойця прызначылі кіраўніком аддзела краязнаўства галоўнай управы. Урэшце быў школьным інспектарам пры аддзеле Беларускай цэнтральнай рады. У 1944 г. выехаў у Германію, імкнуўся адшукаць у Баварыі сляды вывезеных туды беларускіх музейных каштоўнасцей. Пасля вайны працаваў у Германіі ў сістэме школьніцтва лагераў для перамешчаных асоб. У пачатку 1950-х гг. пераехаў у ЗША. Працаваў тавазнаўцам пры Інстытуце вытворчасці моды, у краме вопраткі «Орбакг».

А. Шукелойць — актыўны ўдзельнік жыцця беларускай дыяпары ў ЗША. Ён шматгадовы старшыня Беларуска-Амерыканскага задзіночання, сябра рэдакцыі газеты «Беларус», сябра Беларускага інстытута навукі і мастацтва ў Нью-Йорку. У газетах «Бацькаўшчына» і «Беларус» пад яго прозвішчам і ініцыяламі А. Ш. апублікаваны дзесяткі каштоўных артыкулаў, успамінаў, некралогаў пра мала ці наогул невядомыя падзеі, жыццёвыя лёсы. Ужо ў нашы часы не адзін з маладых эмігрантаў запісваў багатыя на дэталі, каларытныя ўспаміны спадара Антона, — застаецца толькі спадзявацца, што яны з касет пяройдуць на старонкі кніжак.

Дзякучы А. Шукелойцю захаваліся сляды беларускіх музейных скарбаў, вывезеных у час Другой сусветнай вайны ў Германію і Аўстрыю. Цяпер гэтыя звесткі часткова апублікаваны.

А. Шукелойць стаў сапраўдным сімвалам беларускай дыяспары ў ЗША. Як некалі ўсе эмігранты ў ЗША праходзілі праз браму на востраве Эліс, так цяпер усе перасяленцы і госці з Беларусі праходзяць праз яго добразычлівыя рукі, атрымоўваюць ад яго парады і апеку. 22 ліпеня ў зале царквы Жыровіцкае Божае Маці ў Гайланд-парку (штат Нью-Джэрсі) адбылося ўрачыстае ўшанаванне А. Шукелойця ў сувязі з яго 85-гадовым юбілеем.

Літаратура:

1. Пяткевіч А. М. Людзі культуры з Гродзеншчыны: Даведнік. Гродна: ГрДУ, 2000. С. – 331-332.

2. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Ашмянскага раёна. — Мн.: БЕЛТА, 2003. — с 213.

**Янкоўскі Чэслаў**

Чэслаў Янкоўскі (9 снежня 1857, в. Паляны на Ашмяншчыне — 6 кастрычніка 1929; Псеўданімы: Чэслаў; Літвін; Ашмянчук) — польскі пісьменнік (паэт), літаратуразнавец, перакладчык, крытык, публіцыст, гісторык-краязнавец, журналіст.

З шляхецкай сям'і. Скончыў гімназію ў Мітаве (Латвія). Вучыўся на факультэце рускай філалогіі Варшаўскага універсітэта і філасофскім факультэце Кракаўскага універсітэта. З 1883 працаваў у газеце "Kurier Warszawski". З 1889 рэдагаваў "Kurier Codzenny". У 90-я жыў у Палянах. Жыў у Пецярбургу, супрацоўнічаў у часопісе "Кгај" (сакратар часопіса ў 1902-04).

Рэдагаваў "Kurier Wilenski" (1906-08). Адначасова ў 1907 пачаў выдаваць тыднёвік "Glos Polski" орган краёвай партыі Літвы і Беларусі (выйшла 5 нумароў). Удзельнічаў у заснаванні таварыства сяброў навук у Вільні (1907). У 1914 — 18 жыў то ў Вільні, то ў Варшаве. Быў літаратурным кіраўніком польскага тэатра ў Варшаве (1917 — 18). З 1919 стала жыў у Вільні. Супрацоўнічаў у газеце "81сто" (з 1922). У 1920 — 25 — літаратурны дарадца польскага тэатра ў Вільні. Друкаваў вершы (з 1876), апавяданні, артыкулы на тэмы літаратуры (у тым ліку і беларускай), тэатра, музыкі, гісторыі, этнаграфіі, карэспандэнцыі, нарысы, пераклады з Ф. Шылера, Г. Гейнэ, Вальтэра, Ж. Беранжэ, М. Метэрлінка, С. Чэха, І. Тургенева. Выдаў кнігі твораў: "Вершы". Сшыт. 1 (Вільня, 1879), сшыт. 2 (Кракаў, 1881), сшыт. 3 (Варшава, 1884), "З песні Ліцвіна" (Кракаў, 1881), "Арабескі — замалёўкі прозаю" (Варшава, 1884), "Капрычыо, цыкл арабесак" (Кракаў, 1889), "З нататкаў турыста" (Варшава, 1891), "Крыху рыфмаў" (Кракаў, 1892), "Па Еўропе. Карткі з падарожжа" (1893), "Выбраная паэзія" (Варшава, 1897), літаратуразнаўчыя, краязнаўчыя, гістарычна-этнаграфічныя працы: "Постаці паэтаў" (Варшава, 1891), "Заўвагі на палях. Літаратурныя эцюды і ўражанні" (Кракаў, 1896), "Ашмянскі павет. Матэрыялы да гісторыі зямлі і людзей" Ч. 1-4 (Пецярбург, 1896-1900),

"Шэсцьсот гадоў польска-прускіх адносін Г. Сянкевіча, Б. Пруса і Г. Сважэўскага" (Вільня, 1903), “На ўзбочыне літаратуры” (1906), "На працягу двух гадоў. Да пытання пра гісторыю польскай прэсы на Літве" (Варшава, 1908), "Мужыкі" Рэйманта і нямецкая крытыка. Да пытання пра гісторыю нашай літаратуры на чужыне" (Варшава, 1914), "Польскі народ і яго айчына" (Варшава, 1914), "Этнаграфічная Польшча" (Варшава, 1914). “На вастрыі справядлівасці” (Варшава, 1918). “З дня ў дзень” (Вільня, 1923), “З чачоткавай шкатулкі” (1926).

У 1906 годзе быў выбраны дэпутатам I Дзяржаўнай думы. Трымаўся кансерватыўна-ліберальнага кірунку краёўства, актыўна падтрымліваў Кансерватыўна-каталіцкую партыю Літвы і Беларусі. На выбарах у 1-ю Думу заклікаў галасаваць толькі за дэпутатаў-палякаў. Уваходзіў у фракцыю дэпутатаў “Тэрытарыяльнае кола” (“Група дэпутатаў ад заходніх губерняў”). У аграрным пытанні выступаў супраць адчужэння нават часткі памешчыцкіх земляў. У 2-й Думе ўваходзіў у фракцыю “Кола канстытуцыяналістаў”. Крытыкаваў польскіх нацыянал-дэмакратаў, чым выклікаў абурэнне вярхоў польскага грамадства Беларусі і Літвы і што спрычынілася, у ліку іншага, да яго адстаўкі з пасады рэдактара “Кур'ера літэўскага”. Удзельнічаў у віленскім З'ездзе землеўласнікаў (1907).

Аддаваў перавагу ажыццяўленню “польскай краёвай ідэі” перад уласна польскай нацыянальнай ідэяй на землях Літвы і Беларусі (1909), што мелася б вырашыць на карысць тутэйшай польскай грамадскасці польска-літоўскі канфлікт і забяспечыць польскай грамадскасці становішча карэннага этнасу краю. Прытым Янкоўскі не лічыў Літву і Беларусь этнічна польскімі землямі. Выступіў з ідэяй “этнічнай Польшчы” (1914). Пад нямецкай акупацыяй у час 1-й сусветнай вайны выступаў за стварэнне асобнага польскага кіраўнічага органу — “Нацыянальнага польскага сената для Літвы і Беларусі”.

Адмаўляў існаванне беларускай культуры, а беларускую інтэлігенцыю не лічыў часткай народу. У адрозненне ад большасці краёўцаў, варожа ставіўся да развіцця беларускай мовы і культуры, і нават іх адкрыта зневажаў, а свабоду выбару культуры для беларускага народу бачыў як свабоду далучэння да культуры польскай.

Пахаваны на могілках Роса ў Вільні.

Літаратура:

1. Палякі Беларусі і Літвы ў рэвалюцыі 1905—1907 гг. / А. Ф. Смалянчук. — [Гродна]: Ратуша, 2000. — 204 с.
2. Пяткевіч А. М. Людзі культуры з Гродзеншчыны: Даведнік. Гродна: ГрДУ, 2000. С. – 348.
3. Смалянчук А. Ф. Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях. 1864—1917 г. / Пад рэд. С. Куль-Сяльверставай. — Гродна: ГрДУ, 2001. — 322 с.
4. http://www.oshmiany.by/ob-oshmyanah/famouspeople/cheslav-yankovsky.html // Чэслаў Янкоўскі - ПАЛЯНСКІ ПІСЬМЕННІК І ДАСЛЕДЧЫК